Дадатак 1

ПАЛАЖЭННЕ
аб рэспубліканскім творчым конкурсе юных чытальнікаў
“Жывая класіка”

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае мэты і задачы рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка” (далей – Конкурс).

1.2. Заснавальнікамі Конкурсу з’яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, ЗАТ “Сталічнае тэлебачанне”, ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”.

2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

- павышэння цікавасці дзяцей і падлеткаў да чытання;
- развіцця і захавання высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага грамадства;
- выхавання падрастаючага пакалення на лепшых узорах нацыянальнай літаратуры;
- прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблематыкі чытання;
- пашырэння чытацкага кругагляду;
- пошуку і падтрымкі таленавітай моладзі.

2.2. Конкурс прысвечаны Году гістарычнай памяці.

3. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3. Конкурс праводзіцца сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў наступных узроставых групах: 1-4 класы ; 5-6 класы; 7-8 класы, 9-10 класы.

3.1.Конкурс праводзіцца ў чатыры этапы:

- першы этап (раённы) – праводзіцца раённымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Пераможцы раённага этапу Конкурсу, заняўшыя першыя месцы ў кожнай узроставай групе, прымаюць удзел у абласным этапе Конкурсу;
- другі этап (абласны (Мінскі гарадскі) – праводзіцца з 13 па 21 мая абласнымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і Мінскім гарадскім палацам дзяцей і моладзі. Пераможцы абласнога (Мінскага гарадскога) этапу Конкурсу ў кожнай узроставай групе прымаюць удзел у паўфінале;
- трэці этап (паўфінал) – праводзіцца з 1 па 15 чэрвеня арганізатарамі Конкурсу. Пераможцы паўфіналу прымаюць удзел у фінальным этапе Конкурсу;

- чацвёрты этап (фінал) – праводзіцца арганізатарамі Конкурсу напярэдадні, або ў Дзень беларускага пісьменства.

3.2. На кожным этапе Конкурсу вызначаецца па аднаму пераможцу ў кожнай узроставай катэгорыі.

4. ЖУРЫ КОНКУРСУ

4.1. У склад журы Конкурсу на ўсіх этапах уваходзяць вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, настаўнікі, бібліятэкары, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб’яднанняў.

4.2. Крытэрыі ацэнкі выступлення (паказчыкі – балы):

| | |
|---|---|
| глыбіня пранікнення ў вобраз і сэнс твора | ад 0 да 10 |
| выбар тэксту твора | ад 0 да 10 |
| артыстызм выканання | ад 0 да 10 |
| максімальны бал | 30 |

5. УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ

5.1. Усе ўдзельнікі Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэатаў Конкурсу, дыпломамі пераможцаў першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна.

6. ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КОНКУРСУ

6.1 Этапы правядзення Конкурсу шырока асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі.

6.2. Інфармацыйнымі партнёрамі Конкурсу з'яўляюцца: “Выдавецкі дом “Звязда”, часопісы “Вясёлка”, “Бярозка”, “Качели”, “Зорька”, “Рюкзачок” і іншыя СМІ (па ўзгадненню з заснавальнікамі).

6.3. На працягу правядзення этапаў Конкурсу здымаюцца сюжэты і дэманструюцца ў эфіры нацыянальных і рэгіянальных тэлеканалаў.

Тэлеверсія фіналу Конкурсу транслюецца асобнай праграмай у эфіры ЗАТ “Сталічнае тэлебачанне”.

7. ФІНАНСАВАННЕ КОНКУРСУ

7.1. Фінансаванне Конкурсу забяспечваецца заснавальнікамі Конкурсу за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў.

7.2. Могуць выкарыстоўвацца іншыя крыніцы фінансавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.